*Парады бывалых*

# ПЕРШАКУРСНІК... ЯК МНОГА Ў ГЭТЫМ СЛОВЕ!

## або Выпрабаванне на трываласць

**Самы адказны этап у жыцці абітурыента — цэнтралізаванае тэсціраванне — ужо даўно пройдзены, але, чым бліжэй верасень, тым часцей будучага студэнта пачынаюць наведваць думкі пра вучобу. Як гэта будзе? Чаго чакаць ад новай прыступкі ў дарослае жыццё? Знайсці адказы на пытанні дапамогуць тыя, хто ўжо меў магчымасць адчуць, што значыць быць першакурснікам.**

**Вольга ВАРАНЕЦ, II курс Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ:**

— Першы курс для мяне прайшоў вельмі насычана, ярка і прадуктыўна! Я пазнаёмілася з вялікай колькасцю цікавых, матанакіраваных і амбіцыйных людзей, пры стасунках з якімі нельга было самой не стаць такой жа. Пачатак вучобы адкрыў для мяне шмат новых магчымасцяў і перспектыў для рэалізацыі сябе. Напрыклад, на базе нашага факультэта існуе адукацыйны клуб Business Intelligence Club, дзверы якога адчынены для студэнтаў і абітурыентаў ВНУ бясплатна. Мне пашанцавала: мае здольнасці заўважылі і ацанілі, і ўжо з сярэдзіны першага курса я стала кіраўніком гэтага цудоўнага праекта.

Трэба адзначыць, што першы курс — гэта не толькі адна вучоба, але і процьма розных мерапрыемстваў, конкурсаў, турэлётаў. Так што магу з упэўненасцю сказаць: першы курс — гэта крута!

**Дар'я СЯНЬКОВА, II курс Інстытута журналістыкі БДУ:**

— Калі ты не робіш урокі ў школе, настаўнікі будуць з усіх сіл намагацца паўплываць на цябе. Ва ўніверсітэце ты стараешся сам, таму што гэта ў тваіх жа інтарэсах: пасля чарговай сесіі на курсе можа застацца хто-небудзь больш руплівы. Першы курс — гэта магчымасць самому складаць расклад свайго дня, размяркоўваць свае рэсурсы. Тваё бацькі па-ранейшаму падтрымліваюць цябе, але пры гэтым ты ўжо жывеш сваім жыццём. Гэта выдатная трэніровачная пляцоўка перад дарослым жыццём.

Найбольш запомніліся дзве мае пасляхова здадзеныя сесіі. Але не складанасцямі ў здачы экзаменаў, а атмасферай сярод аднакурснікаў. Сесія — гэта час усеагульнага яднання студэнтаў.

**Вольга ТРАФІМЕНКАВА, II курс інжынерна-эканамічнага факультэта БДУІР:**

— Раней заўсёды думалася, што вучоба ў вышэйшай навучальнай установе і школе будзе адрозніваецца не нашмат. Але атрымалася ўсё не зусім так. Адарваўшыся ад бацькоўскага гнязда, можна і прагульваць заняткі. Але ці трэба, калі гэта можа адгукнуцца поўным неразуменнем на наступнай лекцыі?

Напэўна, самая важная і запамінальная падзея ў жыцці яшчэ зусім «зялёных» першакурснікаў — пасвячэнне ў студэнты. І хаця кажуць, што афіцыйна называцца студэнтам першакурснік можа толькі пасля першай сесіі, адабраць у мяне званне «Студэнт БДУІР» я не дазволіла б нікому і да яе!

**Святлана ШАРАМЕТ, II курс факультэта англійскай мовы МДЛУ:**

— Першы курс для мяне — гэта сінонім слова «перамены»: новыя знаёмствы, новыя выкладчыкі. Мне запомніліся вячоркі ў кавярні з аднагрупнікамі і іншыя прыемныя дробязі, напрыклад, выбар падарункаў на дзень нараджэння кожнаму чалавеку ў нашай групе.

Складана было толькі спачатку. Калі ты змяніў свой школьны калектыў на студэнцкі, ты нібы пераехаў з маленькага горада ў мегаполіс. Гэта значыць, трэба быць максімальна гнуткім і камунікабельным чалавекам.

Год вучобы даў мне моцны штуршок у вывучэнні англійскай мовы. Акрамя гэтага, універсітэт — выдатная магчымасць абзавесціся не толькі карыснымі знаёмствамі, але і знайсці нешта сапраўднае: сяброўства ці нават каханне.

**Аляксандра КАЙРЫС, II курс факультэта эканомікі і кіравання гандлем БДЭУ:**

— Для мяне першы курс быў сапраўдным выпрабаваннем на трываласць. Гэта той час, калі ўваходзіш у зусім нязвыклы для цябе рытм жыцця, усё ўжо залежыць толькі ад цябе, ад тваёй стараннасці, часам гнуткасці і, вядома ж, увагі і працавітасці. Так што магу сказаць, што не васямнаццаць гадоў робяць цябе дарослым і адказным, а пройдзены такі этап, як першы курс.

Найбольш запомнілася першая сесія. Я і да гэтага часу здзіўляюся, як змагла яе пераадолець. Цікава было праверыць уласныя сілы і магчымасці.

...Першы курс — час, у які найбольш гарманічна спалучаюцца юнацкія амбіцыі і шырокае кола магчымасцяў. Кожны дзень ва ўніверсітэце — гэта шанц праявіць сябе, раскрыць свае таленты і ўдасканаліць веды. Вельмі важна не баяцца, не спадзявацца на тое, што хто-небудзь заўважыць цябе і прапануе «залатыя горы». Вучоба ў вышэйшай навучальнай установе — гэта пэўная ступень самастойнасці. Таму адказнасць за прафесійную будучыню трэба адразу браць на сябе. І калі ты ўпэўнены ў сваіх сілах і ведах, то зможаш пераадолець любыя перашкоды.

**Марыя ДАРАШКЕВІЧ, студэнтка II курса Інстытута журналістыкі БДУ.**



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЯК ПРЫЕЗДЖЫЯ «ЗАВАЁЎВАЮЦЬ» СТАЛІЦУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Ганна ВАЛЫНЕЦ, прыехала з Вілейкі, таксама ў Мінску ўжо 8 гадоў:**

— Мінск поўны цудоўных людзей, з якіх, на жаль, так мала зрабіліся маімі сябрамі. Гэта горад, дзе адчуваеш сябе вольна. Сталіца, на мой погляд, можа быць добрай школай для развіцця асобы і пашырэння гарызонтаў. Але для мяне яна не той горад, дзе я пражыву жыццё.

**Аляксандр ХАЦКЕВІЧ, прыехаў з Віцебска, «стаж» жыцця ў сталіцы — 4 гады:**

— Я адаптаваўся ў Мінску можа менш чым за месяц. На другім курсе пачаў падпрацоўваць і цяпер ведаю горад не горш (а можа, і лепш) за тых, хто жыве тут з нараджэння.

**Ганна НЯКРАСАВА, прыехала з Гомеля, у Мінску ўсяго год:**

— Мая адаптацыя доўжылася нядоўга: з моманту, калі я засталася на пероне адна з вачыма, поўнымі слёз, і да таго, як упершыню... пасварылася з кімсьці ў метро. Напачатку мне было складана разабрацца з транспартам, я шмат разоў выходзіла не на сваёй станцыі. А так, у прынцыпе, у Мінску я адчуваю сябе лёгка і нязмушана.

**Супрацоўнік псіхалагічнай службы БДУ Юлія ЯЦКЕВІЧ** звяртае ўвагу на матывацыю: яна розная ў тых, хто жыве ў сталіцы з нараджэння, і тых, хто сюды прыехаў. Для апошніх паступленне ва ўніверсітэт з'яўляецца пераломным момантам у жыцці, калі дзіця за кароткі тэрмін ператвараецца ў дарослага чалавека.

Галоўны, надзвычай важны момант — пачатак самастойнага жыцця без бацькоў. Пакуль малады людзі знаходзяцца ў бацькоўскім доме, яны нават не задумваюцца пра такія элементарныя рэчы, як прыгатаванне ежы ці аплата камунальных паслуг. А між тым, калі студэнт не будзе займацца гэтым сам, за яго тое ніхто не зробіць. Здавалася б, дробязі, але яны вучаць адказнасці. Многія мінчане сутыкаюцца з бытавымі абавязкамі толькі пасля заканчэння вучобы, а то і пазней.

З'язджаюць у іншыя гарады і сябры студэнтаў з розных мясцін. Гэта падштурхоўвае да знаёмстваў. У новым асяродку (а для моладзі, якая прыехала, ім з'яўляецца не толькі ўніверсітэт, але і ўвесь горад) даводзіцца наладжваць новыя кантакты прасцей. Кожны дзень студэнт, для якога Мінск — чужы, павінен пытаць пра дарогу ў незнаёмцаў, прасіць парады ў выпадковых людзей накошт цырульні ці крамаў.

Не трэба абмінаць і той факт, што ў сталіцу, як правіла, прыязджаюць найлепшыя выпускнікі. І калі дома яны ўжо нечага дасягнулі, дык тут пра гэта ніхто не ведае. Таму студэнты наноў мусяць працаваць над сваім іміджам: вучыцца на «выдатна», займацца навуковай дзейнасцю або творчасцю. Дарэчы, абсалютная большасць актывістаў у арганізацыях студэнцкага самакіравання — хлопцы і дзяўчаты, якія не з'яўляюцца карэннымі мінчанамі.

Стаўленне да працы таксама адрозніваецца. Невялікае апытанне студэнтаў БДУ дае наступныя вынікі: 7 з 10 студэнтаў, якія прыехалі, падпрацоўваюць, з 10 студэнтаў-мінчан маюць падпрацоўку толькі 4. Першыя пачынаюць шукаць дадатковыя крыніцы даходу ўжо на першым-другім курсе, у той час як другія адкладваюць гэта да трэцяга-чацвёртага курса. Акрамя гэтага, апытанне паказала, што студэнты, перад тым, як ехаць вучыцца ў Мінск, грунтоўна падыходзяць да выбару будучай прафесіі: амаль усе хлопцы і дзяўчаты плануюць пасля выпуску працаваць па спецыяльнасці. Мінчане ж загадваць не спяшаюцца і не выключаюць магчымасці займацца тым, што не звязана з іх навучаннем ва ўніверсітэце.

**Ганна КУРАК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Ведай нашых!*

# Абышоў на фінішы за пяць хвілін

**Беларус Генадзь Караткевіч другі год запар выйграе фінал найпрэстыжнейшага конкурсу праграмавання кампаніі Google.**




Міжнародны чэмпіянат па праграмаванні Google Code Jam праходзіць, пачынаючы з 2003 года. Штогод ён збірае больш за 20 тысяч удзельнікаў, аднак у фінал праходзяць толькі 26 найлепшых. Экс-гамяльчанін, а цяпер студэнт Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі, рашыў пяць задач з шасці, на што выдаткаваў 3 гадзіны 59 хвілін, набраўшы 155 ачкоў. Інтрыга захоўвалася да самага канца. Паводле папярэдніх звестак, беларус ішоў трэцім, а 29 балаў, якія прадвызначылі зыход барацьбы, хлопец набраў усяго за пяць хвілін да заканчэння спаборніцтваў.

Другое месца дасталася прадстаўніку Японіі Макота Саеджыма, трэцяе — выхадцу з ПАР Брусу Мэры. У фінале таксама ўдзельнічаў яшчэ адзін беларус — выпускнік БДУ Раман Удавічэнка, які ў выніковым заліку заняў 18-е месца.

У якасці прыза Генадзь Караткевіч атрымаў 15 тысяч долараў і права на ўдзел у фінале Google Code Jam у наступным годзе. Дзякуючы другой перамозе ўраджэнца Гомеля ў беларусаў ужо тры першыя месцы ў фінале Google Code Jam — больш, чым у прадстаўнікоў любой іншай краіны. У 2013 годзе ў конкурсе перамог выпускнік Белдзяржуніверсітэта Іван Мяцельскі.

Дарэчы, тыднем раней Генадзь Караткевіч стаў трохразовым пераможцам чэмпіянату па спартыўным праграмаванні «Яндекс. Алгарытм». У гэтым годзе на рахунку беларуса таксама перамогі ў Facebook Hacker Cup (другі раз запар) і ACM ICPC (у другі раз).

Генадзю Караткевічу прысвечаны асобны артыкул у сусветнай інтэрнэт-энцыклапедыі. Як паведамляе англамоўная «Вікіпедыя», хлопчык аказаўся ў цэнтры ўсеагульнай увагі, калі быў заяўлены ў якасці ўдзельніка на міжнародную алімпіяду па інфарматыцы сярод школьнікаў (IOI) ва ўзросце 11 гадоў, што з'яўляецца сусветным рэкордам. Генадзь Караткевіч стаў самым юным абсалютным пераможцам алімпіяды і трымаў сваё лідарства на гэтым конкурсе з 2009 па 2011 год.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Незвычайны праект*

# КУЛЬТУРА ПА АБМЕНЕ

**Студэнты і выпускнікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, а таксама Турынскага і Міланскага дзяржаўных універсітэтаў працавалі сёлета разам у міжнародным лагеры ў Калінкавіцкім раёне.**

Праект рэалізоўваўся на падставе дагавора, заключанага БДПІ з Італьянскай гуманітарнай асацыяцыяй PUER, якая ініцыявала арганізацыю лагера ў канікулярны перыяд для беларускіх дзяцей, што пражываюць на пацярпелых пасля чарнобыльскай катастрофы тэрыторыях Калінкавіцкага раёна. Дапамогу ім, як і аздараўленне ў Італіі, група валанцёраў вяла шмат гадоў. Аднак не ўсе дзеці маглі выехаць за межы краіны на аздараўленне. Так нарадзілася ідэя арганізацыі цікавага адпачынку па месцы іх жыхарства. Італьянцы цягам года рыхтаваліся да працы з дзецьмі ў культурным крос-лагеры, наведваючы лекцыі па псіхалогіі, сацыялогіі, медыцыне. Замежныя валанцёры знаёміліся з асаблівасцямі беларускай культуры, менталітэту, характару. Беларускую групу студэнтаў склалі ўдзельнікі псіхалагічнага тэатра пластычнай імправізацыі «АКМЕ», якія на базе лабараторыі сацыяльна-псіхалагічных праблем сучаснай беларускай моладзі пры кафедры сацыяльнай псіхалогіі БДПІ падрыхтавалі ўласную праграму працы ў лагеры. Яна мела на ўвазе стварэнне крэатыўных лабараторый тэатральнага, мастацкага, дэкаратыўна-прыкладнога, песеннага, танцавальнага напрамкаў.

Аздараўленчы лагер размяшчаўся на базе Юровіцкай сярэдняй школы. Валанцёры штодня выязджалі, каб сустрэцца і арганізаваць работу з дзецьмі з Мазырскага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, а таксама ў вёсках Малыя Аўцюкі, Прудок, Хоўна, Агароднікі. У прытулку сацыяльна-педагагічнага цэнтра ў той час знаходзілася 15 дзяцей ва ўзросце ад чатырох да сямнаццаці гадоў. Штодня беларускія і італьянскія валанцёры праводзілі з дзятвой розныя развіваючыя мерапрыемствы: гульні, заняткі па лепцы, маляванню, пляценню. Нягледзячы на моўны бар'ер, адкрытасць і добразычлівасць італьянцаў дазволіла ім знайсці агульную мову з дзецьмі.

У склад важатых міжнароднага лагера ўваходзілі дзевяць італьянскіх юнакоў і дзяўчат, дзве дзяўчыны з Паўднёвага Судана, адна калумбійка. Усе — студэнты і выпускнікі італьянскіх універсітэтаў. Апроч таго, у лагеры працавалі і пяць беларусак — студэнтак і выпускніц Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Для Італьянскай гуманітарнай асацыяцыі гэта быў першы вопыт па арганізацыі такога лагера, тым не менш і італьянскі, і беларускі бакі ацанілі яго як вельмі цікавы і выключна станоўчы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**